# Скарбы пінскай зямлі

**Музей Беларускага Палесся — адна з найстарэйшых і найцікавейшых музейных устаноў у краіне. Ён дзейнічае ў Пінску з 1924 года і ніколі за 95 гадоў не спыняў сваю работу. За гэты час сабрана больш чым 75 тысяч экспанатаў. «І ўсе яны арыгінальныя. Мы не трымаем копій», — падкрэсліла дырэктар музея Ірына ДЗЯМЧУК.**



**Драўляны веласіпед — адзін з унікальных экспанатаў музейнай экспазіцыі.**

Ірына Генадзеўна расказала, што ў багатай археалагічнай калекцыі маюцца ўнікальныя знаходкі: косці мамантаў, валасатых насарогаў, якія насялялі Палессе ў каменным веку, кераміка і бронзавыя ўпрыгажэнні з магільнікаў зарубінецкай культуры, каменны саркафаг з Турава, старажытныя маёлікавыя пліткі і шмат іншага. У нумізматычнай калекцыі — восем манетных кладаў, рэдкія антычныя, а таксама польскія, літоўскія, шведскія, рыжскія манеты.



У раздзеле этнаграфіі яшчэ ў 30-х гадах з'явіўся незвычайны экспанат — драўляны ровар. Яго змайстраваў паляшук з вёскі Багданаўка Васіль Ільючык. Тады завадскі ровар быў для вяскоўца сродкам раскошы, нібы сучасная даражэзная іншамарка. А ўмелец з Багданаўкі паглядзеў на арыгінал ды зрабіў сваю мадэль ровара, цалкам драўляную. Металічныя ў ім толькі ланцуг і педалі. Калі вясковы майстар не без форсу заехаў на кірмашовы пляц у Пінску, навуковыя супрацоўнікі музея, што там былі, прыйшлі ў захапленне ад ровара. Пачаліся доўгія перамовы аб набыцці экспаната. Паляшук спачатку не хацеў прадаваць сваю веламашыну, але цана роўная кошту каровы стала вырашальным аргументам. Васіль Ільючык прадаў свой выраб музею і ўвекавечыў уласнае майстэрства для нашчадкаў.

Цяпер адзіны ў краіне такога кшталту экспанат упрыгожвае раздзел этнаграфіі музея і займае пачэснае месца ў праекце «Скарбы пінскай зямлі», які прысвечаны статусу культурнай сталіцы. У ходзе праекта экспануюцца скарбы, знойдзеныя падчас раскопак у рэгіёне. Першую калекцыю — скарб срэбных манет часоў Рэчы Паспалітай — прадставілі ў сакавіку. Кожны каляндарны квартал прэзентуе новы скарб.

